мастацкі свет, самастойны і самадастатковы, у аснове якога жыццёвая і творчая біяграфія пісьменніка, сфарміраваная і пражытая ў выпрабаваннях гісторыі разам са сваім народам.

Асобныя творы І. Пташнікава экранізаваны на беларускім тэлебачанні. У 1969 г. паводле апавядання "Сцяпан Жыхар са Сцежыц" быў пастаўлены кароткаметражны тэлефільм "Родам адсюль"; у 1974 г. створаны фільм паводле аповесці "Тартак"; у 1990 г. – паводле рамана "Алімпіяда". Творы прызнанага майстра нацыянальнай прозы набылі шырокую вядомасць не толькі ў беларускага чытача. Сёння яны перакладзены і чытаюцца на рускай, украінскай, польскай, латышскай, балгарскай, англійскай, французскай мовах... Іх асноўны змест пра чалавека, з'яднанага з прыродай, з гісторыяй ваеннай і пасляваеннай, з цяжкай працай беларуса-сейбіта на сваёй зямлі.

Сёння нельга ўявіць сучасную беларускую літаратуру без Івана Пташнікава – самабытнага таленавітага пісьменніка. У яго творах закладзены код любові да Бацькаўшчыны, шанавання велічнай і трагічнай беларускай гісторыі, трывушчага і несмяротнага народа. Яны ўтрымліваюць не толькі ўрокі мінулага, але і трывогі пісьменніка-мысляра за наш заўтрашні дзень.

**Спіс літаратуры**


1. **Андраюк, С.** Ад роднай зямлі / С. Андраюк // Полымя. – 2002. – № 9-10. – С. 269–295.
2. **Андраюк, С.** Біяграфія ў трагічным гістарычным кантэксце / С. Андраюк // Полымя. – 2007. – № 10. – С. 142–154.
3. **Андраюк, С.** Іван Пташнікаў / С. Андраюк // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ ст. : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. – Мінск, 2001–2002. – Т. 4, кн. 1. – 2002. – С. 490–520.
4. **Андраюк, С.** Чалавек на зямлі : нарыс творчасці Івана Пташнікава / С. Андраюк. – Мінск : Маст. літ., 1988. – 252 с.
5. **Кавалюк, А. С.** Проза Івана Шамякіна 70-х гг.: жанрава-стылёвая спецыфіка, канкрэтна-гістарычны і аксіялагічны змест / А. С. Кавалюк // Веснік Брэсц. ун-та. Серыя 3, Філалогія. Педагогіка. Псіхалогія. – 2019. – № 2. – С. 50–55.
6. **Мехаў, У.** Нельга не парадавацца / У. Мехаў // Літаратура і мастацтва. – 1999. – 20 жн. – С. 4.


*Майстэрства творцы*


Ганна НАВАСЕЛЬЦАВА,
кандыдат філалагічных навук


# ВОБРАЗ АДМОЎНАГА ГЕРОЯ Ў РАМАНЕ ІВАНА ПТАШНІКАВА

УДК 821.161.3-311.4:316.624.2


У артыкуле на прыкладзе раманаў "Чакай у далёкіх Грынях", "Мсціжы", "Алімпіяда (воблакі шасцідзясятых)" І. Пташнікава раскрываюцца эстэтычныя стратэгіі ўвасаблення адмоўнага героя. У першым рамане па-мастацку даследуюцца пераасэнсаванне асобай сваіх учынкаў, грамадскае прабачэнне як сацыяльны феномен. Надалей адмоўны персанаж увасабляецца найперш як псіхалагічна глыбокі і значны для выяўлення аўтарскай ідэі вобраз. Увага да адмоўнага героя паказальна рэпрэзентуе дынаміку праблематыкі і вобразнай палітры айчыннай прозы, падкрэслівае індывідуальнасць творчай манеры мастака слова.

Ключавыя словы: *раман, адмоўны герой, раманная сітуацыя, канфлікт, Іван Пташнікаў.*

The article uses the example of the novels "Wait in the distant Hryni", "Mscižy", "Alimpijada (clouds of the sixties)" by I. Ptašnikau to reveal the aesthetic strategies of the embodiment of the negative hero. The first novel artistically explores the reinterpretation of a person's actions, public forgiveness as a social phenomenon. The negative character is embodied primarily as a psychologically deep and significant image for revealing the author's idea. Attention to the negative hero significantly represents the dynamics of the problematic and figurative palette of Belarusian prose, emphasizes the individuality of the creative manner of the artist of the word.


Раман мэтазгодна разумець як адкрытую змястоўную форму сінкрэтычнага ўвасаблення рэчаіснасці, што адлюстроўвае пісьменніцкую канцэпцыю канфліктных узаемаадносін асобы і навакольнага асяроддзя, асэнсоўвае дамінантныя аксіялагічныя вектары духоўнага жыцця грамадства і ў выніку пацвярджае эстэтычную традыцыю або палемізуе з ёй. Раманная сітуацыя патрабуе раскрыцця складаных узаемастасункаў героя і яго антыпода, што не заўсёды паслядоўна паказвалася ў буйной беларускай прозе. Галоўны герой найчасцей выступае носьбітам аўтарскай сімпатыі, выяўляе маральна-этычнае крэда пісьменніка, падтрымліваецца яго аўтарытэтам, што пацвярджаецца багатай колькасцю прыкладаў з айчыннай раманістыкі. Антыгерой працяглы час увасабляўся пераважна схематычна, яго псіхалагічны партрэт не распрацоўваўся належным чынам. Такому вобразу ў раманах 1945–1965-х гг. аддавалася нязначная аўтарская ўвага, паколькі лічылася, што пісьменнік павінен паказваць узорныя і найлепшыя якасці чалавечай асобы. Тым не менш дынаміка рамана патрабавала ўскладнення канфліктных узаемаадносін, паглыблення псіхалагічных партрэтаў як героя, так і антыгероя.

Іван Пташнікаў (7 кастрычніка 1932 г., в. Задроздзе Плешчаніцкага раёна – 28 ліпеня 2016 г.,

Мінск) выступае адным з тых пісьменнікаў беларускай літаратуры 2-й паловы XX ст., чыя спадчына дазваляе наглядна прасачыць эвалюцыю ў паказе вобраза адмоўнага героя, а значыць, і ўскладненне эстэтычнай палітры айчыннага рамана. У буйной прозе 1950-х гг. асэнсаванне разнастайных праяў мірнага жыцця ўвасаблялася пераважна праз паказ аднаўлення народнай гаспадаркі, стваральнай дзейнасці. У раманах "Святло над Ліпскам" (1949–1952) М. Паслядовіча, "У добры час" (1949–1954) І. Шамякіна, "За годам год" (1955–1956), "Вясеннія ліўні" (1957–1960) У. Карпава канфлікт, які датычыць найперш вытворчых пытанняў, здараецца паміж найлепшым і добрым героямі, заяўлены агульнапрынятыя сацыяльныя ўзоры ў адлюстраванні асобы, прадстаўлены шматлікія функцыянальныя фонавыя персанажы. Эстэтычны вектар пад уздзеяннем працэсаў дэмакратызацыі літаратуры і грамадства паступова перамяшчаецца на паказ чалавечых узаемаадносін і патрабуе развіцця мастацкага псіхалагізму, у выніку пераадольваецца сацыяльная схематызацыя персанажаў, што і раскрывае раман **"Чакай у далёкіх Грынях"** (1960) Івана Пташнікава.

Ацэньваючы раннюю прозу пісьменніка, у тым ліку і першы раман, С. Андраюк пераканаўча даводзіць пэўную спрошчанасць, схематычнасць у паказе станоўчых герояў. Пры гэтым "атрымаліся яркія, поўныя жыццёвых сокаў малюнкі прыроды, бытавыя сцэны, каларытныя і праўдзівыя адмоўныя персанажы: яны ўсе на паверхні, духоўны свет іх такі неглыбокі і мізэрны, што, па сутнасці, увесь раскрываецца ў вонкавых праяўленнях" [1, с. 495–496]. Актыўная праца ў калгасе выступае для І. Пташнікава найперш фонам, на якім адбываецца мастацкае дзеянне. Ідэалізуецца малады старшыня калгаса, якога з павагай называюць Станіславам Пракопавічам. Ён выдатна разумее людзей і сам дае ўзор маральна-этычных паводзін, хоць вобраз застаецца статычным. Значная мастацкая ўвага аддадзена не столькі станоўчым героям – перадавым калгаснікам, якіх у творы пераважная большасць, колькі персанажам, што здзяйсняюць шэраг негатыўных учынкаў і за гэта асуджаюцца аднавяскоўцамі. Раманка Пэрац, Платон Джвучка, Мірон Выжлятнік паказаны ў дынаміцы маральна-этычных складнікаў.

Аўтар раскрывае вясковую рэчаіснасць праз успрыманне студэнта Леаніда Гаўрылава, які вяртаецца дадому, піша фельетон у раённую газету пра аднавяскоўца, Рамана Пэрца, празванага *Раманка – плясніві грыб* [3]. Вобраз Раманкі ўводзіцца з дапамогай мастацка-публіцыстычных сродкаў выразнасці, выкарыстоўваюцца фельетонны гумар, іронія. У пачатку рамана чытач бачыць асобу шаржыраваную, паказаную як сумоўе агульных маральна-этычных заганаў і недахопаў: "*Такім Раманку ведае ўся вёска... Цяпер ён пасталеў. Зусім мужчына. І гарэлкі бярэ больш*" [4, с. 51]. З дапамогай сродкаў пераважна знешняга псіхалагізму ствараецца мастацкае ўвасабленне героя, які імкнецца зрабіцца лепшым, разважае, што кахаць можа кожны, а вось кахаюць – не кожнага, што дэманструе ўнутраны свет з духоўным патэнцыялам, хоць герой шмат вагаецца і памыляецца. Цяжка перажывае свой браканьерскі ўчынак, нават хварэе. Развіццё падзей паказвае: кампанія несумленных людзей, як Выжлятнік, Джвучка, адмоўна ўплывае на ўсіх, хто апынаецца побач з імі.

Калі Раманка ўвасоблены ў святле аўтарскага спачування, то Выжлятнік і Джвучка ствараюцца найперш цёмнымі фарбамі: героі заўсёды гатовыя скрасці калгаснае, а таксама выпіваюць, б'юцца, лайдачаць, браканьераць. Тым не менш паміж героямі ёсць адрозненні, якія становяцца відавочнымі ў час палявання на лася. Платон Джвучка пасля стрэлу "*вярсты з чатыры дуў шалёнага пешака*" [4, с. 158], але зразумеў марнасць намаганняў і адступіўся. Пра Мірона аўтар лаканічна, але шматсэнсоўна зазначае, што жылі ў лесе двое – Выжлятнік і лось, – і цяпер ім стала цесна. Пісьменнік наглядна паказвае такую рысу характару, як зацятасць: баляць плечы, пяршыць у горле, сінее ўваччу, аднак "*Выжлятнік рвецца без роздуму, без развагі. Здаецца, упадзе на снег – усё роўна стане паўзці, дзерці мёрзлы дол да імху...*" [4, с. 159].

Пра злачынства ў лесе становіцца вядома вяскоўцам. Канфлікт ускладняецца тым, што пры нявысветленых абставінах знікае былы старшыня Андрэй Дзедзіха, падазрэнні пры адсутнасці доказаў падаюць на Выжлятніка і Джвучку. Апраўданні герояў раскрываюць іх маральна-этычныя партрэты. Мірон сцвярджае, што "*сам чалавек сабе на лоб гуза шукаў... Сам пад лёд пайшоў. А што я з ім тады піў... Дык з кім я не піў?*" [4, с. 200], і абвінавачвае Андрэя ў патуранні іх агульным злачынным справам, не разумее паводзін былога хаўрусніка, які чамусьці мяняе стаўленне да іх узаемаадносін. Платон здольны асэнсоўваць свае ўчынкі, змяняцца да лепшага, што ілюструе яго заява, разгледжаная на праўленні калгаса. Джвучка просіць "*памагчы выкруціцца са штрафу*" [4, с. 233] за забітага лася, які не мае чым заплаціць, паколькі "*я таго лася не біў, а біў яго Пэрац*" [4, с. 233], абяцае зноў хадзіць на працу. З Платона смяюцца вяскоўцы, аднак зноў прымаюць у калгас, дзе заўсёды патрэбныя рабочыя рукі.

Выжлятніка праганяе з працы новы ляснічы, і самы зацяты шкоднік нечакана пачынае баяц-

ца пушчы, якая столькі гадоў хавала ад людзей ягоныя рабункі, і не ведае, за што ўзяцца далей [3]. Застаўшыся без былых хаўруснікаў, якія пачалі мяняцца да лепшага, Мірон баіцца сітуацыі "адзін супраць усіх". У парыве гневу і адчаю ён падпальвае лес, каб хоць такім чынам адпомсціць вяскоўцам. Спалохаўшыся ўласнага ўчынку, кліча людзей на дапамогу, яна патрэбная не столькі ў тушэнні пажару, колькі яму самому. Крыху пазней Выжлятнік сустракае Станіслава Пракопавіча, які прызнаецца, што ледзь збілі агонь, відавочна здагадваецца, хто падпаліў, але прапануе Мірону мажлівасць да выратавання – запрашае на працу.

Такім чынам, усе адмоўныя героі ў рамане "Чакай у далёкіх Грынях" паступова прымаюць правілы паводзін станоўчых персанажаў, аўтар акцэнтуе ўвагу на пераасэнсаванні асобай учынкаў, адлюстроўвае грамадскае прабачэнне як сацыяльны феномен. У цэлым у беларускім рамане 1945–1965-га гг. пісьменнікі малююць героя як чыннага ўдзельніка падзей у ваенны час і ў перыяд мірнай працы, пераважае мастацкая рэпрэзентацыя героя, які прытрымліваецца пэўных правілаў паводзін, выступае прадстаўніком сацыяльнай групы: рабочых, сялян, інтэлігенцыі; выкарыстоўваюцца партрэты, дыялогі герояў, сродкі прамога псіхалагізму (аўтарская характарыстыка, унутраныя маналогі персанажа). У беларускім рамане 1966–1985-х гг. унутраны свет героя ўраўнаважаны знешняй падзейнасцю. Вобразы герояў аўтарскай сучаснасці, ваеннага мінулага канкрэтызуюцца і дэталізуюцца на аснове псіхалагічнага, біяграфічнага, аўтабіяграфічнага пісьма. У агульнай сістэме твора ўзмацняецца ідэйна-мастацкая значнасць раскрыцця індывідуальнага характару, прадметнарэчыўнага свету, дыялогаў герояў, ужываюцца сродкі і прамога (унутраныя маналогі, няўласна-прамое маўленне героя), і ўскоснага (псіхалагічны пейзаж, адлюстраванне мімікі, жэстаў, манеры гаварыць) псіхалагізму, скіраваныя на паказ духоўнага свету асобы.

У рамане **"Мсціжы"** (1970) у параўнанні з першым раманам "падзеі не апісваюцца, а даследуюцца, аналізуюцца" [2, с. 7], тут "цэнтраімклівая" сістэма арганізацыі вобразаў, ускладненыя хранатопавыя каардынаты, на сэнсаўтваральным узроўні выкарыстоўваецца імпліцытны псіхалагізм. Дамінантным эстэтычным прынцыпам выступае суб'ектыўнае ўзнаўленне рэчаіснасці, яе інтэрпрэтацыя галоўным героем, выразнікам аўтарскай пазіцыі. Андрэй Вялічка паказаны ў драматычнай сітуацыі, калі абвастраецца ўспрыманне навакольнага свету, узрастае патрабавальнасць да маральна-этычнага складніка. Духоўны свет героя ілюструецца праз ваенныя ўспаміны і адносіны да прыроды. Мастацкі псіхалагізм І. Пташнікава вядзе да раскрыцця не толькі яркай індывідуальнасці, але і адметнага нацыянальнага характару, што выступае і сацыяльным тыпам. У творы малюецца спецыфічная раманная сітуацыя, яна дазваляе прасачыць канфлікт галоўнага героя і персанажаў, што ўваходзяць у яго мікраасяроддзе [3].

Пісьменнік паказвае некалькіх адметных, відавочна адмоўных персанажаў, кожны з якіх рэпрэзентуе пэўны аспект сацыяльнай рэчаіснасці. Строгім начальнікам паказаны галоўны апанент Вялічкі Унук, ён вызначаецца нячуласцю, недаверам да людзей, нежаданнем разбірацца ў канкрэтнай сітуацыі. Паказальная яго самахарактарыстыка ў дыялогу з галоўным героем: "*...я чалавек кручаны, мяне на мякіне не правядзеш... Я быў і ў чорта на рагах...*" [5, с. 206]. Як ацэнка Унука ўспрымаецца выказаная Андрэем ва ўнутраным маналогу заўвага, што ў чорта на рагах начальнік, можа, і быў, толькі гэта на дабро яму не пайшло, калі так гаворыць. Сэнсавызначальнай выступае такая партрэтная дэталь, як вочы, што ў хвіліну эмацыйнага ўзрушання "*паменшалі, памякчэлі, як пачыналі ўсё роўна шкадаваць. Але Андрэй яму не верыў*" [5, с. 205]. Унук паслядоўна дэманструе спажывецкія адносіны да прыроды і людзей, выяўляецца ў рамане пераважна ў стане эмацыйнага ўзрушэння, гнеўным і крыклівым, яго вобраз выпісаны пераважна цёмнымі фарбамі.

Вызнае ўласную філасофію Падбярэцкі, які паказаны нязгоршым працаўніком і ў якога "*свая мерка, як аршын, ні вышэй ні ніжэй: мы – маленькія людзі...*" [5, с. 218], а значыць, трэба ўмець хаваць гонар і прасіць за цябе вышэйшых. Справядлівасць, самапавага – добрыя якасці, але не яны патрэбныя ў першую чаргу маленькаму чалавеку, якому, каб спраўляцца з усімі абставінамі, трэба паводзіцца ціхмяна і выконваць усе загады начальства, не абавязкова яго паважаючы. Такія паводзіны знішчаюць асобу, хоць маналог героя паказвае, што той здольны разумець прыродны свет, супастаўляць звярыныя паводзіны з чалавечымі, спачуваць і шкадаваць, але перш за ўсё на словах. Сумесны браканьерскі ўчынак – паляванне на лася – Андрэя Вялічкі і Падбярэцкага зніжана паказвае апошняга як крыху смялейшага за сабаку. З Падбярэцкім кантрастуе галоўны герой, які ледзьве не загінуў, змагаючыся з мядзведзем. У ацэнцы гэтага ўчынку раскрываецца яшчэ адзін персанаж, Вуль, які імкнецца зразумець, чаму Андрэй свядома рызыкаваў, паколькі на ўласным вопыце ўсвядоміў высокую каштоўнасць жыцця.

Вуль распавядае Андрэю пра сваё ваеннае мінулае, у якім быў здзейснены ганебны ўчынак:

герой уцякае з-пад расстрэлу, пакінуўшы сям'ю. Усведамленне зробленага не адпускае доўгія гады: "*Думаеш, мне цяпер лёгка?.. Мне было б лягчэй, каб я тады вярнуўся да калёс. Можа б, і вярнуўся, каб па мне не стралялі... Але па мне стралялі. Я ўжо не мог вярнуцца. У тую хвіліну я скамянеў... Я думаў толькі пра сябе...*" [5, с. 308]. Спавядальны маналог героя раскрывае яго самаапраўданне, сцвярджэнне ідэі, што пра сябе трэба думаць перш за ўсё, а таксама непрыманне таго, што Вялічка пайшоў на мядзведзя найперш таму, што імкнуўся даказаць сваю рацыю Унуку. Раманная сітуацыя арганізавана такім чынам, што ўзаемадзеянне Вялічкі з Унукам, Падбярэцкім, Вулем падштурхоўвае да духоўных пошукаў найперш галоўнага героя, які імкнецца вывяраць уласныя маральна-этычныя прыярытэты і ў выніку пераадольвае ўнутраныя ваганні. Названыя персанажы з мікраасяроддзя не развіваюцца, не змяняюць перакананняў, заснаваных на не самым лепшым жыццёвым вопыце.

У рамане **"Алімпіяда (воблакі шасцідзясятых)"** (1984) І. Пташнікава дынамічна спалучаны розныя апавядальныя стратэгіі: пісьменнік стварае шматгеройны раман, але вылучае вобраз галоўнай гераіні, праз суб'ектыўна афарбаваную інтэрпрэтацыю рэчаіснасці, дзе дамінуе не столькі паказ падзей, колькі ўвага да духоўнага свету асобы, рэпрэзентуе шырокаахопны малюнак часу. Мастак слова звяртаецца да паглыбленага псіхалагізму, ужывае тыпізацыю, выкарыстоўвае прыёмы лірычнага пісьма для шматграннага паказу грамадскай атмасферы. Ускладненая суб'ектная арганізацыя прадвызначае сюжэтны рух, выяўляе адметныя хранатопавыя каардынаты. Такім чынам, нельга адназначна пагадзіцца з традыцыйным меркаваннем некаторых крытыкаў, што талент пісьменніка падкрэслена эпічны. Эстэтычныя мажлівасці лірычнай формы рамана істотна трансфармуюць эпічную аснову, выяўляюць і новыя мастацкія дасягненні ў развіцці змястоўнай формы, і пісьменніцкае наватарства [3].

Акцэнтуецца суб'ектыўнае ўспрыманне рэчаіснасці выбраным героем. Па-мастацку ўзнаўляецца асобасны свет персанажаў з мікраасяроддзя галоўнай гераіні: гэта Таня, Ратнікаў, Фірага і многія іншыя, паказаныя і ў найлепшых духоўных праявах, і ў святле ўчынкаў, абумоўленых заганамі. "Пісьменнік надае пільную ўвагу апісанню вачэй, позіркаў, жэстаў, знешняга выгляду" [7, с. 122], у рамане шматаспектна перадаюцца маўленчыя адметнасці герояў, у выніку чаго ствараюцца псіхалагічна глыбокія мастацкія характары [7]. Так, кантрастуюць легкадумныя, малаадказныя, але па-чалавечы шчырыя Фірага і ўпэўнены ў сабе, надзейны, працавіты, але пры гэтым чэрствы да людзей Ратнікаў.

Героі паказваюцца ў канфліктнай жыццёвай сітуацыі: абодва заляцаюцца да Тані, якая не гатовая выбраць паміж імі. Ратнікаў праяўляе клопат, аднак Таня падсвядома адчувае іх духоўную рознасць: «*Можа б, і прывыкла яна нанава да Ратнікава недзе там, на цаліне, куды ён цягнуў яе адразу пасля арміі, ці ў Барысаве ў СМУ. Ці ў другім якім месцы, дзе не ходзяць "прычэпы" з леспрамгасаўскай аўтакалоны. Дзе не высоўваецца з кабіны саламяная галава і не глядзіць кожны раз з вуліцы на двор...*» [6, с. 77]. Чуйная да свету і людзей, Таня ўпадабала Фірагу, які гаворыць злосна, а вочы смяюцца, што выдае чалавека добрага, у той час як у Ратнікава злосці на дваіх. Цікава, што такая ацэначная характарыстыка выказваецца Таняй, якую Фірага бачыць у сне, калі засынае за рулём і ледзьве не разбіваецца, а значыць, менавіта так герой думае пра сябе і Ратнікава. Такім чынам пісьменнік раскрывае чалавечую падсвядомасць, што працуе на мастацкі вобраз. Мроячы пра Таню, Фірага застаецца непасрэдны як дзіця, нават гатовы крыўдзіць абранніцу, паколькі яшчэ не навучыўся паважаць іншых. Калі здараецца сапраўдная трагедыя і Фірага гіне, Ратнікаў праяўляе недаравальную нячуласць і злосна папракае гераіню, па сутнасці, за праяву пачуцця – гора ад страты значнага для яе чалавека.

Многія праблемныя аспекты чалавечых узаемаадносін дэманструюць стасункі дарослых і падлеткаў, што па-майстэрсту перадае І. Пташнікаў, раскрываючы і ўнутраны стан непаўналетняй асобы – Валеркі, і паказальныя ўчынкі сталых людзей. Хлопец расце бязбацькавічам, маці шмат выпівае, і болей за іншых пра Валерку клапоціцца чужы яму Ратнікаў, да якога падлетак горнецца за магчымасць пакіраваць машынай, аднак гэта трэба зарабіць: выконваць даручэнні, у прыватнасці знаходзіць запчасткі. Пра Валерку Алімпіяда мімаходзь зазначае, што той хоць і малы, хітры і чалавек будзе злосны, паколькі здараецца выпадак, калі ён вядзе людзей не да быкоў, якіх спяшаліся ратаваць, а да п'янага пастуха Рамана: "*Яму калолася ў босыя ногі па сухіх вострых дудках скошанай канюшыны, ён падымаў іх высака, як бацян на балоце, але веў*" [6, с. 143]. Дадзеная галоўнай гераіняй ацэнка аўтарытэтная, разам з тым вобраз Валеркі паводле суадносін станоўчага і адмоўнага далёка не адназначны.

Хлопца цягне да Ратнікава, і "*сваім дзіцячым розумам ён ужо даходзіў, што ў чалавека павінен быць чалавек, да якога яго б цягнула, і што яго, Валерку, зусім не цягне да маткі, якую ён і заве, як усе ў вёсцы: Волька...*" [6, с. 249]. Падлетак ба-

люча перажывае вясковыя плёткі, з якіх даведваецца, што яго бацька – Корань з Белага, якога нават зненавідзеў. Уцякае з дому, дзе збіраецца п'яная кампанія, якая выклікае жаль і пагарду. Як лаканічна зазначае пісьменнік, на волю штурхала ўсё яго кароценькае жыццё, халоднае з першых жа год, *«абмацюганае шафярнёй, абсмуроджанае тытунёвым дымам і самагонным гарам і праколатае вясковым бабскім пальцам: "Байструк!"»* [6, с. 257]. Герой, які ніколі не меў цеплыні і чуласці, бунтуе супраць усіх, таму зганяе пакінутую Фірагам машыну. Воля і дарога, удакладняе аўтар, відаць, і робяць вясковых хлопцаў шафёрамі, што ў выніку раскрывае вобраз Валеркі на ўзроўні мастацкага абагульнення.

Іван Пташнікаў у шматаспектным сацыяльным кантэксце паказвае цяжкага падлетка, у чым бачыцца істотнае пісьменніцкае наватарства. Кантрастуе з бунтоўным Валеркам, увасабляе пасіўнасць, чалавечую бязвольнасць яго бацька Корань, які мае трапныя вясковыя мянушкі: Фінагент, Лайдак. Схільны да выпіўкі, ён перажывае, што нялёгка складваюцца адносіны з жонкай, што ў іх няма дзяцей. Тым не менш герой не праяўляе ніякага клопату пра Валерку, нават калі апошні трапляе ў аварыю, хоць і хвалюецца за яго. Здаецца, Корань усведамляе сваю памылку: "*Што я не мог глянуць яму зблізку ў вочы? У мяне ж не было на каго глядзець. Усё жыццё сваё я толькі і глядзеў у бутэльку ды на Два метры фанеры... Цярпець яе не магу, Антонавіч*" [6, с. 293], але і надалей нічога не робіць, каб неяк выправіць сітуацыю.

Адметна, што майстар слова, ідэалізуючы і ўзвышаючы галоўную гераіню, іншых персанажаў паказвае аб'ектыўна, адлюстроўвае вартасці і недахопы, дазваляе чытачу самому сфарміраваць ацэнку. Эмацыйна стрымана раскрываюцца героі, якіх не будзе перабольшваннем назваць злавеснымі і якія выступаюць маральнымі антыподамі Алімпіяды. У час ваеннай акупацыі становіцца паліцаем малодшы Кукаеў, які паказаны катам, апантаным жаданнем забіваць. Больш складаны вобраз – Далідчык-Мамка, маральны канфлікт з якім, распачаты ў ваенным мінулым, вырашаецца ў аўтарскай сучаснасці. Вобраз былога паліцая раскрываецца з дапамогай сэнсава ёмістых дэталяў. Напрыклад, пра тое, што яна, Уліма, усё памятае, ён гаворыць "*кораценька і рэзка – брэхам*" [6, с. 39]. Алімпіяда слухае найбольш моўчкі і не глядзіць на няпрошанага госця, а калі ўсё ж зірнула, убачыла, што Далідчык-Мамка ашчэрыўся, як сабака, і "*ў яго ўсе верхнія зубы залатыя – гарацЬ, як вуголле ў пячуры*" [6, с. 41]. Асацыяцыі ўзмацняюцца дзякуючы паводзінам героя, пра якія шмат пісалася ў айчынным літаратуразнаўстве: не столькі просіць, колькі патрабуе ад Алімпіяды пасведчыць яго невінаватасць, хоць агучаны спавядальны маналог стварае ва ўяўленні чытача супрацьлеглае ўражанне.

Такім чынам, раманы "Чакай у далёкіх Грынях", "Мсціжы", "Алімпіяда (воблакі шасцідзясятых)" Івана Пташнікава раскрываюць такія сродкі рэпрэзентацыі героя, як маналог з элементамі споведзі, дыялог адмоўнага і станоўчага персанажаў з прамой або ускоснай ацэнкай, самаацэнка, самахарактарыстыка. Калі вобраз станоўчага героя нязменна выступае носьбітам найважнейшых каштоўнасцяў, то вобраз адмоўнага героя, уключаны ў раманны канфлікт, выклікае неадназначнае стаўленне і паступова ўскладняецца. У рамане "Чакай у далёкіх Грынях" не зусім псіхалагічна пераканаўча для сучаснага чытача паказана выпраўленне адмоўных герояў, якім аддадзена значная мастацкая ўвага. У рамане "Мсціжы" адмоўныя персанажы не змяняюцца да лепшага, аднак паказваюцца пераважна ў мікраасяроддзі галоўнага героя, адцяняюць яго станоўчыя якасці, у чым і заключаецца іх галоўнае функцыянальнае прызначэнне. Назіраецца іерархія персанажаў паводле маральна-этычных вартасцяў у рамане "Алімпіяда (воблакі шасцідзясятых)", дзе ў цэнтры раманнай сітуацыі ўвасоблена ідэалізаваная галоўная гераіня, у яе мікраасяроддзі – розныя паводле суадносін станоўчых і адмоўных якасцяў персанажы, псіхалагічна глыбокія і па-мастацку самастойныя, а на перыферыі – пераважна адмоўныя героі, якія не страчваюць значнасці для раскрыцця аўтарскай ідэі.

### Спіс літаратуры

1. **Андраюк, С. А.** Іван Пташнікаў / С. А. Андраюк // Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – Мінск, 2002. – Т. 4, кн. 1. 1966–1985. – С. 490–520.

2. **Грамадчанка, Т.** След мудрай чалавечнасці : вялікая эпічная форма ў творчасці Івана Пташнікава / Т. Грамадчанка // Роднае слова. – 2002. – № 10. – С. 4–9.

3. **Навасельцава, Г. В.** Жанр рамана ў беларускай літаратуры другой паловы XX – пачатку XXI ст. : манаграфія / Г. В. Навасельцава. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2020. – 268 с.

4. **Пташнікаў, І.** Збор твораў : у 4 т. / І. Пташнікаў. – Мінск : Маст. літ., 1990–1992. – Т. 1 : Раман ; апавяданні / прадм. С. Андраюка. – Мінск, 1990. – 478 с.

5. **Пташнікаў, І.** Збор твораў : у 4 т. / І. Пташнікаў. – Мінск : Маст. літ., 1990–1992. – Т. 3 : Аповесць ; раман. – Мінск, 1992. – 512 с.

6. **Пташнікаў, І.** Збор твораў : у 4 т. / І. Пташнікаў. – Мінск : Маст. літ., 1990–1992. – Т. 4 : Раман. – Мінск, 1992. – 575 с.

7. **Ткачук, В.** Праблема псіхалагізму і мастацкага характару ў сучасным літаратуразнаўстве / В. Ткачук // Полымя. – 2014. – № 1. – С. 116–123.